УДК 808.26–085.3

# НЕКАТОРЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ВЫКАРЫСТАННЯ ПРЫМЕТНІКА *ГЛЫБОКІ* Ў МОВЕ ЯНКІ КУПАЛЫ

**Скачкова Валянціна Аляксандраўна**
дацэнт кафедры замежных моў і міжкультурных камунікацый
установы адукацыі Федэрацыі прафсаюзаў
«Міжнародны ўніверсітэт «МІТСО»;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт

*У артыкуле даследуецца творчая спадчына Янкі Купалы як каштоўная крыніца вывучэння станаўлення новай беларускай літаратурнай мовы. Творчасць Янкі Купалы адлюстроўвае зрухі, што адбываліся ў мове ў тыя часы, дае багаты, надзейны матэрыял для вывучэння працэсаў выпрацоўкі і замацавання нормаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы на ўсіх яе ўзроўнях.*

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Новая беларуская літаратурная мова склалася на аснове гаворак Беларусі, а таксама зазнала ўплыў рускай, украінскай, польскай моў. Таму пачатак XX стагоддзя – гэта перыяд пошуку таго адзінага слова, той адзінай формы гэтага слова, якія б найбольш поўна адлюстроўвалі характэрныя рысы нашай мовы. Творчая спадчына выдатнага майстра слова Янкі Купалы з'яўляецца каштоўнай крыніцай вывучэння станаўлення новай беларускай літаратурнай мовы, бо адлюстроўвае зрухі, што адбываліся ў мове ў тыя часы.

Своеасаблівым спецыфічным пластам у мове выданняў Купалы з'яўляюцца прыметнікі памеру ці, як іх яшчэ называюць, прасторавай якасці.

Для дадзенай групы прыметнікаў характэрна тое, што яны абазначаюць толькі тыя прыкметы, якія размяшчаюцца па той ці другі бок ад 'пункту адліку'. Калі ж прыкмета прадмета адпавядае норме, то яна ніяк не абазначаецца [7, с. 21]. Абавязковым для такіх прыметнікаў з'яўляецца наяўнасць антонімаў. Яны належаць да агульнаўжывальнай лексікі беларускай мовы і з'яўляюцца абавязковымі як асноўны сродак дакладнага і выразнага маўлення. Гэтым адзінкам уласціва натуральнасць, прастата, агульназразумеласць, адсутнасць штучнасці, мудрагелістасці.

Сярод іх вылучаюцца прыметнікі з азначэннем глыбіні.

Тэматычная група 'глыбіня' прадстаўлена ў купалаўскіх творах адзіным словам праславянскага паходжання *глыбокі* (**glybok*) 'які мае вялікую глыбіню' [6, 1, с. 415; 8, 3, с. 97]; параўн. руск. *глубокий*, укр. *глибокий*, польск. *głęboki*, чэш. *hluboky*, славен. *globoko*.

У гэтым значэнні прыметнік *глубокыи* ўжываўся ў старажытнарускай мове [2, 1, с. 520]. У тыя часы ён яшчэ абазначаў паняцці 'позні; вельмі моцны; значны, сур'ёзны' [4, 4, с. 35].

У старабеларускай мове слова *глубокии* (*глыбокии*) выкарыстоўвалася са значна шырэйшым семантычным аб'ёмам: 'глыбокі', які мае вялікую працягласць зверху ўніз: які размешчаны, знаходзіцца на вялікай глыбіні; які мае вялікую працягласць у прасторы; які мае высокую ступень праяўлення

пэўнай уласцівасці; які дасягнуў вышэйшай стадыі; грунтоўны, сур'ёзны, важны; у знач. наз.' [1, 6, с. 295].

У мове Купалы прыметнік *глыбокі* мнагазначны. Прамое асноўнае значэнне лексемы *глыбокі* 'які мае вялікую глыбіню' рэалізуецца ў кантэксце з канкрэтнымі назоўнікамі са значэннем прадметнасці: *Тым часам ваду цягаюць з глыбокіх студняў дапатопнымі вочапамі малыя дзеці* (З гуты «Залессе»). Адценне значэння 'тоўсты слой' паказвае велічыню снежнага покрыва: *Ночнай парою з бара недалёкага Нейкае зданне – глянуці страх – Чуць лезе з гурбаў з снегу глыбокага,* (Зімою).

Спецыфіка прыметніка *глыбокі* характарызаваць памер прадмета не вонкава, а знутры і абумовіла канкрэтны змест яго пераносна-метафарычных значэнняў, якія вызначаюцца абстрактнасцю і выяўляюць высокую, значную ступень праяўлення пэўных з'яў. Дадзеная лексема ў значэнні 'важны, істотны' спалучаецца з абстрактнымі назоўнікамі, якія называюць пэўныя ўласцівасці чалавека: *Дух калектывізму з'яўляецца зараз глыбокай нутранай рысай характару калгасніка* (Сам напаўняешся вялікай радасцю). Рэалізацыя значэння 'які дасягнуў высокай ступені, поўны' адбываецца ў спалучэнні з абстрактнымі назоўнікамі, якія абазначаюць стан асобы: *Лётнае майстэрства, ваенная кемлівасць пілота лейтэнанта Бугрымовіча В. І. выклікае глыбокае захапленне* (Айчынная вайна і беларуская інтэлігенцыя). У значэнні 'моцны, вялікі (пра пачуцці, стан)' прыметнік спалучаецца з абстрактнымі назоўнікамі, якія таксама абазначаюць стан асобы: *Сніцца край лепшы, далёкі, Жаль падступае глыбокі...* (Стужа зблізжаецца). Разам з назоўнікам *удзячнасць* прыметнік *глыбокі* выражае пачуцце 'шчыры, сардэчны': *У дзень слаўнага дваццаціпяцігоддзя ленінскай «Праўды» выказваю* [Купала] *пачуццё гарачай любові, пачуццё глыбокай удзячнасці газеце,* (Сардэчнае прывітанне бальшавіцкай «Праўдзе»!). Значэнне 'аддалены ад граніц чаго-н. або размешчаны ў сярэдзіне чаго-н.' ўзнікла на аснове семы 'далёкі' і рэалізуецца ў спалучэнні з прасторавымі паняццямі: *На няўзброеным самалёце па асабістаму заданню маршала Савецкага Саюза тав. К. Я. Варашылава лейтэнант правадзіў разведку ў глыбокім тыле ворага* (Айчынная вайна і беларуская інтэлігенцыя).

Купалаўскія кантэксты фіксуюць пераносна-вобразныя значэнні лексемы *глыбокі*, не адлюстраваныя ў слоўніках сучаснай беларускай літаратурнай мовы: вобразн. 'строгі, жорсткі' *І ад глыбокай турмы Да да высокага прастола – Усе мы ў золаце і голы* (Каўказ); перан. 'багаты, пранікліві' *..усю тую цемру Прарэзала святлом нязмерным веры, Бліснула іскрамі, І пацяклі струмені, Такія мкністыя, глыбокія такія, Як думы собраных на з'ездзе нацый* (Ленін).

Развіццё мнагазначнасці лексемы абумоўлена наяўнасцю агульных сувязей паміж прадметамі, якія паслужылі падставай для асацыятыўнага збліжэння гэтых прадметаў і пераносу назвы з аднаго на другі. Усе пераносныя значэнні слова *глыбокі* з'яўляюцца больш абстрактнымі, чым іх першае значэнне і маюць спецыфічна кніжны характар.

Трэба адзначыць, што на Беларусі ў дыялектным выкарыстанні прыметнік *глыбокі* (*глубокі*) вядомы толькі ў значэнні 'глыбокі, які мае вялікую працягласць зверху ўніз': *Глыбокая-праглыбокая рака* [3, 1, с. 452]; *Глубокая талерка* [3, 1, с. 452].

У сучаснай беларускай літаратурнай мове прыметнік *глыбокі* фіксуецца з наступным семантычным аб'ёмам: 'які мае вялікую глыбіню; далёкі, які знаходзіцца далёка ад паверхні ці пранікае на значную глыбіню; пранікліві (пра позірк, вочы): даўно мінулы, аддалены (пра час); змястоўны, важны; значны, істотны (пра змест, уклад у што-н.): які дасягнуў высокай ступені; поўны, моцны (пра пачуцці, стан і пад.); нізкі, шчыры (пра паклон)' [5, 2, с. 59].

У мове Купалы наглядаецца шэраг вытворных ад слова *глыбокі* лексем, належачых да розных часцін мовы. У сувязі з гэтым нагадаем, што перыяд станаўлення новай беларускай літаратурнай мовы характарызаваўся актыўным працэсам словаўтварэння, які вызначаўся зменамі ў слоўнікавым складзе мовы, абумоўленыя значнымі пераменамі ў жыцці нашага грамадства.

Прыметнік *неглыбокі* (прэфікс *не-*) у Купалы абазначае супрацьлегласць таму, што названа ўтваральным словам *глыбокі*: *А сканаю, злучуся з зямлёю, Вы курган мнен насыпце высокі, Бо, як будзе мой дол неглыбокі, Не знайду і па смерці спакою* (Сяброўцам па долі).

Адпрыметнікавае прыслоўе *глыбока* сустракаецца ў мове Купалы ў значэнні 'на вялікую глыбіню': *І з'аралі сваю ніву Шырака, глыбока..* (Арлянятам); а таксама ў пераносным значэнні 'пра стан чалавека': *Думкі скрыты памрокай: То прасветласць, то цьма там; Уздыхаем глыбока Над сабою, над братам* (На Палессе).

Прыслоўе *глыбока*, у сваю чаргу, з'яўляецца састаўной часткай складанага слова *глыбокапатрыятычны*, утворанага шляхам зрашчэння кампанентаў словазлучэння ў адно слова: *За месяцы Айчыннай вайны беларускія пісьменнікі стварылі нямала натхнёных, глыбокапатрыятычных мастацкіх твораў,..* (Айчынная вайна і беларуская інтэлігенцыя).

Назоўнік *глыбіня* (*глыбіна*) 'аддаленасць ад паверхні чаго-н. да дна' ўтвораны шляхам далучэння суфікса *–ін-* да ўсечанай асновы прыметніка *глыбокі* (без *-ок*): *Глыбіня, шырыня дапасаваны, Не дагодзіць так бацьку і сын* (Грабар); *Не зрабіць нікому гэткай дамавіны, І не вырыць яму гэтакай глыбіны, Каб у іх з вачэй мне Беларуссю-маці, Як людзей хаваюць гэтак пахаваці* (Я ад вас далёка...).

Ад названай адзінкі ўтвораны прыметнік *глыбінны* (*-н-*), ужыты Купалам у пераносным значэнні 'аддалены, патаемны': *..партыя самая чалавечая і сапраўды народная, якая радзілася івырасла ў самых глыбінных нетрах народа* (Кліч да беларускага народа).

Пры ўтварэнні нульсуфіксальнага назоўніка *глыб* адбылося скарачэнне ўтваральнай асновы прыметніка *глыбокі*. У купалаўскіх кантэкстах гэта адзінка сустракаецца ў значэннях: 'аддаленасць ад паверхні чаго-н. да дна' (*Дол глыбок, і пясок над магілінай, Як і глыб, -- гэтак высака ўзрос.* Грабар); 'унутранае багацце' (*..публіка хацела б даўжэй астацца з героем, якога яна ўжо па п'есе палюбіла, яго душою, якая цікавіць у сваіх глыбах у такі рашучы момант жыцця, як перад смерцю* (Кастусь Каліноўскі).

Найбольш важным для ўзбагачэння слоўнікавага складу беларускай мовы з'яўляецца марфалагічны спосаб, з дапамогай якога папаўняліся розныя часціны мовы, хаця і з неаднолькавай прадуктыўнасцю.

Творчасць Янкі Купалы дае багаты, надзейны матэрыял для вывучэння працэсаў выпрацоўкі і замацавання нормаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы на ўсіх яе ўзроўнях.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Гістарычны слоўнік беларускай мовы / пад рэд. А. М. Булыкі ; Нац. акад. навук Беларусі; Цэнтр даслед беларус. культуры, мовы і літ., Ін-т мовазнаўства імя Якуба Коласа. – Мінск : Беларуская навука, 1982–2017. – Т. 1–37.
2. Срезневский, И. И. Материалы для Словаря древнерусского языка / труд И. И. Срезневского. – Москва : ГИС, 1958. – Т. 1–3.
3. Слоўнік беларускіх гаворак паўднёва-заходняй Беларусі і яе пагранічча : у 5-ці т. / Уклад. Ю. Ф. Мацкевіч, А. І. Грынавецкене, Я. М. Рамановіч [і інш.] ; рэд. Ю. Ф. Мацкевіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979–1986. – Т. 1–5.
4. Словарь русского языка XI–XVII вв. / АН СССР, Ин-т рус. яз. ; редкол.: С. Г. Бархударов (отв. ред.) [и др.]. – Москва : Наука, 1975–1988. – В. 1–28.
5. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы / пад агульн. рэд акадэміка АН БССР К. К. Атраховіча (Кандрат Крапіва): у 5-ці т. – Мінск : Галоўная рэдакцыя Беларускай Савецкай Энцыклапедыі, 1977. – Т. 1–5.
6. Фасмер, Макс. Этимологический словарь русского языка : в 4 т. / Макс Фасмер ; пер. с нем. и доп. О. Н. Трубачева. – 4-е изд., стер. – Москва : Астрель : АСТ, 2007.
7. Шрамм, А. Н. Очерки по семантике качественных прилагательных : На материале соврем. рус. яз. / А. Н. Шрамм. – Ленинград : Изд-во ЛГУ, 1979. – 134 с.
8. Этымалагічны слоўнік беларускай мовы / уклад.: І. І. Лучыц-Федарац, Г. А. Цыхун ; рэд. В. У. Мартынаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978–2017. – Т. 1–14.



Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова